Лявонаў, В. Спачатку нас было 14, потым стала без малага 3000 / В. Лявонаў // Голас Сенненшчыны. – 1998. – 24 лют. – С. 3.

СПАЧАТКУ НАС БЫЛО 14, ПОТЫМ СТАЛА БЕЗ МАЛАГА 3000

Ва ўсіх вёсках, праз якія пралягаў наш маршрут, нас сустракалі з вялікай радасцю, са слязамі на вачах. Многія хлопцы і дзяўчаты выказвалі жаданне стаць байцамі атрада. Але ўзяць усіх, на вялікі жаль мы не маглі. Не хапала зброі, бралі тых, хто аказаўся больш прадбачлівым, прыбярог вінтоўку ці кулямёт, знойдзеныя на месцы баёў у час наступления немцаў.Тым не менш на зыходзе лета атрад ператварыўся ў адну з буйнейшых па тым часе партызанскіх брыгад, якая ўжо састаяла з 5 атрадаў. Налічвалася каля 800 байцоў.

У канцы жніўня ў Казённы лес, які мы выбралі для свайго лагера, прыбылі партызанскія брыгады Заслонава і Бойкі. супраць якіх немцы арганізавалі карную экспедыцыю, выкарысгаўшы рэгулярныя вайсковыя часці. Сілы былі няроўныя. Бойка, які выконваў абавязкі камандуячага зонай, вырашыў вывесці з-пад удару брыгаду. Ён запрасіў да сябе і загадаў – заняць паўночную ўскраіну Казённага лесу ў раёне вёскі Узносная, прыкрыць адыход асноўных сіл, у тым ліку і нашай брыгады. Я застаўся з узводам Уладзіміра Ванцеева. У нашу задачу уваходзіла затрымаць карнікаў, калі яны з боку вёскі Дубавая паспрабуюць уварвацца ў лес. Мы мелі на сваім узбраенні акрамя аўтаматаў і вінтовак 12 кулямётаў. Агонь адкрывалі па карніках, падпусціўшы іх прыкладна на 50–60 метраў. Дзве спробы прарвацца скончыліся для іх поўным правалам. Для 70 салдат гэта быў апошні бой. Тады немцы адкрылі агонь з гармат і мінамётаў, спадзяючыся ўзяць рэванш. Мы ж патаемнымі сцежкамі выйшлі на след брыгад. Спыніліся ў Цяроблыскім лесе. Тут чакала нас звестка, якая глыбока ўзрушыла ўсіх. У многіх вёсках немцы арыштавалі нашых сувязных, а таксама бацькоў партызан – усяго 80 чалавек. У іх ліку і чатырнаццацігадовага хлапчука Мішу Шыбеку, які аказаў нямалую паслугу, калі фарміраваўся атрад. Са сваімі сябрамі, такімі ж хлапчукамі, як і ён, сабраў на месцы баёў з немцамі 30 тысяч патронаў, зняў з падбітых нашых танкаў 20 кулямётаў і ранняй вясной 1942 г. перадаў мне.

Арыштаваныя знаходзілісяў Вятнінскім гарнізоне. Многіх з іх, як стала вядома, немцы збіраліся назаўтрашні дзень расстраляць. Марудзіць было нельга. Жаданне ісці вызваляць арыштаваных выказаў увесь асабовы састаў брыгады. Я выбраў 20 чапавек, у тым ліку ветэранаў брыгады В. Шаўцова, П. Кацара, І. Грыцкіх. Узначаліць групу даручыў майму намесніку Хаіркізаву. Задача была з нялёгкіх. Вятнінскі гарнізон быў добра ўмацаваны і ўзброены. У каменных будынках, на вадакачцы ўстаноўлены кулялямёты. Разлічваў на нечаканасць, раптоўнасць нападэення. Разлік апраўдаўся. Раніцай Хаіркізаў са сваёй групай даставіў усіх вызваленых у партызанскі лагер, а заадно 13 здраднікаў, узятых у палон.

Як высветлілася, арышты былі зроблены па данасу Яўгена Малахоўскага, які па заданию немцаў прыйшоў да нас у партызаны. Паслугач немцаў атрымаў па заслугах.

У кастрычніку Канстанцін Заслонаў запрасіў мяне да сябе. Бойку выклікалі ў Беларуси штаб партызанскага руху. Камандаванне Аршанска-Сенненскай зоны перайшло да Канстанціна Заслонава. Я ўзяў з сабой свайго намесніка Хаіркізава, начальніка штаба Сыценку, камандзіра атрада Каракетава.

Дарога аказалася перакрытай немцамі, якія прыбылі з Оршы, каля адной з вёсак мы сутыкнуліся з імі. Яны наладзілі пагоню за намі. Пра гэта стала вядома Заслонаву. Ён адправіў на дапамогу і пошукі сваіх людзей. Сустрэліся з ім толькі на другі дзень. Заслонаў давёў да нашага ведама рашэнне Віцебскага абкома партыі аб забароне выхаду партызанскіх атрадаў і брыгад за лінію фронту. Тэмай нашай гаворкі, абмеркавання сталі праблемы, звязаныя з надыходам зімы, што трэба зрабіць, каб пазбегнуць пралікаў, якія бьші дапушчаны ў першую зімоўку, як лепш наладзіць узаемадзеянне брыгад, актывізаваць і ўзмацніць іх баявыя дзеянні.

З Заслонавым у мяне ўстанавіліся добрыя адносіны з першай жа нашай сустрэ чы, якая адбылася ранняй вясной 1942 года.

Ён меў пастаянную сувязь з Вялікай зямлёй, быў добра інфармаваны аб падзеях на фронце. Ахвотна згадзіўся сустрэцца з байцамі нашага атрада. зрабіць інфармацыю, заадно падарыў радыёпрыёмнік. Мы ў сваю чаргу выдзелілі яму са сваіх запасаў 2 ручныя кулямёты. Ён не заставаўся ў даўгу перад намі. Кожны раз, калі атрымліваў дастаўлены самалётамі груз са зброяй і боепрыпасамі, дзяліўся з намі. На гэты раз нам перапала багата аўтаматных патронаў, а кожнаму з нас ён асабіста ўручыў па аўтамату ППШ. Дарэчы, мы іх упершыню бачылі.

Гэта была мая апошняя сустрэча з Заслонавым, Праз некалькі дзён да нас у брыгаду прыбыўЛюдзвіг Іванавіч Сяліцкі, камісар Заслонаўскай брыгады. Ен паведаміў горкую для ўсіх нас вестку. У вёсцы Купаваць у няроўным баі з карнікамі загінуў Заслонаў. Брыгаду даручана ўзначаліць яму, Сяліцкаму. Ён папрасіў парэкамендаваць з саставу нашай брыгады кампетэнтнага кадравага ваеннага на пасаду начальніка штаба брыгадьі. Я прапанаваў памочніка начальніка штаба Віктара Нікіфаравіча Смірнова. З ім Сяліцкі адразу знайшоў узаемаразуменне, у яго асобе ўбачыў патрэбнага чалавека, які валодае неабходнымі дзелавымі і прафесійнымі якасцямі. Сяліцкі не раз гаварыў мне пра гэта пры сустрэчах.

Як стала нам вядома, Гімлер, начальнік паліцыі рэйха, рэйхсфюрэр СС, які нёс адказнасць за бяспеку на захопленых усходніх тзрыторыях, занепакоены шыроюм размахам у Беларусі партызанскага руху, які па сутнасці паралізаваў дзейнасць нямецкай адміністрацыі, стварыў сур’ёзную пагрозу для войск, што дыслацыраваліся тут, асабліва ў

прыфрантавых раёнах, прыйшоў да высновы аб неабходнасці перайсці да больш рашучых дзеянняў, арганізацыі буйнамаштабных баявых аперацый з удзелам армейскіхпадраздзяленняў, выкарыстаннем авіяцыі.

Такое рашэнне ён прыняў неўзабаве пасля тага, яку жніўні 1942 года наведаў Мінск, каб атрымаць інфармацыю, што называецца, з першых рук.

Карная экспедыцыя, у час якой загінуў Заслонаў, відаць, была адна з такіх акцый, арганізаваных камандаваннем тылу армейскай групоўкі "Цэнтр", з удзелам вайсковага падраздзялення так званай рускай народна-вызваленчай арміі.

Сенненскі раён значыўся ў ліку тых, дзе немцы аказаліся ў тупіковым становішчы. Туг пад кантролем партызан знаходзілася пераважная большасць населеных пунктаў, а раённы цэнтр па сутнасці ў асадзе. За лета мы змаглі разграміць найбольш важныядля немцаў апорныя пункты, якімі сталі створаныя імі паліцэйскія гарнізоны.

Баявыя аперацыі такога роду мы перанеслі на суседнія раёны. Зыходзілі з таго, каб стварыць найбольш шырокі аператыўны прастор, неабходныя ўмовы манеўрыравання, асабліва ў час карных нямецкіх экспедыцый. У лістападзе быў разгромлены гарнізон у вёсцы Забор'е Бешанковіцкага раёна, а ноччу 22 снежня ў мястэчку Чарэя Чашніцкага раёна. Вялікая заслуга тут належыць падпольшчыкам на чале з М. Я. Браслаўцавым, з якім я падтрымліваў сувязь праз сувязную Вольгу Сіўцову. Па яго просьбе на дапамогу падпольшчыкам я накіраваў памочніка начальніка штаба С. Камягіна з 75 добра ўзброенымі партызанамі Аперацыя прайшла паспяхова. Былі захоплены склады са зброяй і боепрыпасамі, іншай ваеннай маёмасцю, зярном. Больш за 100 жыхароў мястэчка папоўнілі рады байцоў брыгады.

У выніку баёў за авалоданне бальшака Чашнікі – Чарэя разгромілі гарнізоны ў вёсках Граеўшчына, Слідцы, Закур'е, Прьдвор'е, Лукомль Чашніцкага раёна. Крыху пазней гарнізоны ў Ходцах, Ладзікава, Лядзічы, Крыльцова, яшчэ ўцалелыя ў Сенненскім раёне.

В. Лявонаў